ет семейные ценности и брачно-семейные отношения; содержит порнографические материалы и (или) эротику.

**Заключение.** Действительно, одним из главных факторов сохранения духовно-нравственных ценностей белорусского общества является формирование и укрепление правовых основ государственной информационной политики Республики Беларусь.

Принятые информационно-правовые нормы, направленные на защиту духовно-нравственных ценностей целесообразны, но не достаточны.

Очевидно, что не только ребенок, но и совершеннолетняя личность, должна иметь право на защиту от информации, причиняющей вред ее духовно-нравственной сфере, здоровью и развитию. Полагаем, соответствующие изменения и дополнения должны быть внесены в законодательство Республики Беларусь об информации, информатизации и защите информации, о средствах массовой информации.

Принятых правовых актов стратегического и программного характера не достаточно для реализации государственной информационной политики. Необходимо принятие концептуального правового акта, содержащего предписания организационного и распорядительного характера в области реализации государственной информационной политики, например, Концепции государственной информационной политики Республики Беларусь.

## АБ НЕКАТОРЫХ ПРАБЛЕМАХ КВАЛІФІКАЦЫІ НЕЗАКОННАГА АБАРАЧЭННЯ НАРКАТЫЧНЫХ СРОДКАЎ, ПСІХАТРОПНЫХ РЭЧЫВАЎ ДЫ ІХ АНАЛАГАЎ У СВЯТЛЕ ВУЧЭННЯ АБ ТРЫВАЛЫХ ЗЛАЧЫНСТВАХ

*С.А. Сілаеў*
*Кемерава, КемДУ*

На працягу апошніх гадоў злачынствы, звязаныя з незаконным абарачэннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў ды іх аналагаў (далей для сцісласці — «наркотыкі»), стабільна займаюць другое месца ў агульнай структуры зарэгістраванай расійскай злачыннасці, саступаючы толькі раскраданням чужой маёмасці. У сувязі з гэтым пытанні кваліфікацыі дадзенай катэгорыі грамадска небяспечных учынкаў набываюць асаблівую значнасць – як тэарэтычную, так і практычную.

Мэта працы палягае ў высвятленні праблемаў, звязаных з юрыдычнай ацэнкай дзеянняў па незаконным абарачэнні наркотыкаў, у той меры, у якой яны датыкаюцца з агульным вучэннем аб трывалых злачынствах.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыялаў для даследавання выкарыстаныя дзеючае расійскае і беларускае крымінальнае заканадаўства, судовая практыка, а таксама працы навукоўцаў-карністаў па адпаведнай тэматыцы. Даследаванне грунтуецца на юрыдыка-дагматычным метадзе.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пачынаючы з 2003 г. расійскі заканадавец дыферэнцуе адказнасць за ўдзел у незаконным абарачэнні наркотыкаў перш за ўсё ў залежнасці ад таго, ці перасследаваў суб’ект мэту збыту. Але падчас рэформы складу нарказлачынстваў разнесенымі па розных нормах аказаліся прыкметы не толькі суб’ектыўнага (як гэта мае месца ў рамках арт. 328 КК РБ), але і аб’ектыўнага боку. Арт. 228 КК РФ прадугледжвае пакаранне за незаконныя набыццё, захоўванне, перавозку, выраб ды перапрацоўку наркотыкаў без мэты збыту, тады як у арт. 228.1 КК РФ гаворка ідзе аб незаконных вытворчасці, збыце і перасылцы гэткіх рэчываў.

Амаль усе даследчыкі адносяць да ліку трывалых злачынстваў захоўванне прадметаў, абмежаваных у абарачэнні, уключаючы, зразумела, і наркотыкі. Разам з тым, як расійскі, так і беларускі заканадаўцы прадугледжваюць, апрача захоўвання наркотыкаў, яшчэ і іхнюю перавозку, якая таксама з’яўляецца трывалым злачынствам. Але ні закон, ні кіраўнічыя тлумачэнні нашых вярхоўных судоў не дазваляюць дакладна размежаваць гэтыя дзве формы злачынных паводзінаў.

Паводле п.п. 9 і 10 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 2003 г. № 1 «Аб судовай практыцы па справах аб злачынствах, звязаных з наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іхнімі прэкурсорамі і аналагамі, моцнадзейнымі і атрутнымі рэчывамі (арт. 327 – 334 КК)», пад незаконным захоўваннем наркотыкаў належыць разумець

любыя наўмысныя дзеянні, звязаныя з фактычным знаходжаннем их у валоданні вінаватага (пры сабе, у тайніку, у памяшканні ды іншых месцах), а пад перавозкай — наўмысныя дзеянні па іх перамяшчэнні з аднаго месца ў іншае, у тым ліку ў межах аднаго і таго ж населенага пункта, учыненыя з выкарыстаннем любога віду транспартных сродкаў. Прыблізна такія ж азначэнні аналізаваных паняццяў дае і Пленум Вярхоўнага Суда Расійскай Федэрацыі ў п.п. 7 і 8 сваёй пастановы ад 15 чэрвеня 2006 г. № 14 «Аб судовай практыцы па справах аб злачынствах, звязаных з наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі, моцнадзейнымі і атрутнымі рэчывамі». Аднак жа ўслед за гэтым расійскі Пленум дадае: «…трэба мець на ўвазе, што незаконная перавозка [наркотыкаў] можа быць ажыццёўлена з іх утойваннем, у тым ліку ў спецыяльна абсталяваных тайніках у транспартным сродку, багажы, вопратцы, а таксама ў поласцях цела чалавека або жывёлы і да т.п. Пытанне аб наяўнасці ў дзеяннях асобы складу злачынства — незаконнай перавозкі без мэты збыту і аб адмежаванні гэтага складу злачынства ад незаконнага захоўвання без мэты збыту [наркотыкаў] падчас паездкі павінна вырашацца судом у кожным канкрэтным выпадку з улікам накіраванасці намеру, фактычных абставінаў перавозкі, колькасці, памеру, аб'ёму [наркотыкаў], месца іх знаходжання, а таксама іншых акалічнасцяў справы». У сувязі з гэтым паўстае цэлы шэраг пытанняў: як колькасць наркотыкаў і іх фізічныя характарыстыкі могуць дапамагчы адрозніць захоўванне ад перавозкі? якую ролю ў гэтым адрозненні можа адыгрываць месца знаходжання прадмету злачынства, калі што пры захоўванні, што пры перавозцы ён можа знаходзіцца або ў тайніку, або ў адзенні вінаватага («пры сабе»)? навошта ўвогуле размяжоўваць дадзеныя паняцці, калі на адказнасць гэта, па вялікім рахунку, не ўплывае, бо ўчыненае ўсё адно кваліфікуецца як адзінае злачынства па адной і той жа норме крымінальнага закона? чаму не ахапіць захоўванне і перавозку агульным тэрмінам (напрыклад, «валоданне» ці «трыманне»)? Гэта тым больш мэтазгодна, калі ўзяць пад увагу, што стасоўна зброі ды боепрыпасаў закон прадугледжвае яшчэ і трэцюю форму супрацьпраўнага валодання – нашэнне, што адпаведным чынам уплывае на разуменне паняццяў захоўвання і перавозкі ды яшчэ больш заблытвае справу.

Заўважым, што ў арт. 228.1 КК РФ (у адрозненне ад ч.ч. 2 – 5 арт. 328 КК РБ) асобна не прадугледжана адказнасць за захоўванне (як, зрэшты, і за набыццё) наркотыкаў з мэтай збыту. Адсюль для расійскіх судовых і следчых органаў выцякае неабходнасць кваліфікаваць гэткія паводзіны па правілах аб нясконачаных злачынствах. Наогул, гаворка тут павінна была б весціся аб падрыхтоўцы да збыту, бо ў наяўнасці відавочнае стварэнне ўмоў дзеля наступнага адчужэння (рэалізацыі) наркотыкаў, якое аднак яшчэ не з'яўляецца пачаткам ажыццяўлення аб'ектыўнага боку дадзенага складу злачынства. Але Пленум Вярхоўнага Суда Расійскай Федэрацыі ў п. 13.2 вышэйзгаданай пастановы рэкамендуе судам у гэткіх выпадках асуджваць вінаватых за замах на збыт, што ў пэўнай меры дэфармуе традыцыйнае для айчыннага крымінальнага права ўяўленне аб стадыях наўмысных злачынстваў, заснаванае на палажэннях фармальна-аб'ектыўнай тэорыі.

Гаворачы аб захоўванні наркотыкаў, Вярхоўныя Суды Беларусі і Расіі называюць яго дзеяннем. Некаторыя тэарэтыкі лічаць, што гэта бяздзейнасць [1, с. 78]. На наш погляд, абедзве пазіцыі не ўпісваюцца ва ўяўленні аб дзеянні і бяздзейнасці як, адпаведна, аб актыўнай і пасіўнай форме паводзінаў: з аднаго боку, падчас захоўвання не здзяйсняецца ніякіх рухаў цела; з іншага боку, і аб невыкананні абавязкаў тут наўрад ці можна гаварыць без вялікай нацяжкі. Таму ёсць падставы пагадзіцца з тымі, хто разглядае захоўванне як самастойную форму крымінальна-супрацьпраўных учынкаў, што існуе нароўні з дзеяннем і бяздзейнасцю [2, с. 19; 3, с. 12–14]. У сувязі з гэтым можна паставіць пытанне аб легітымнасці крымінальна-прававой забароны гэткага «невядома чаго», асабліва калі ўзяць пад увагу, што набыццё і захоўванне наркотыкаў без мэты збыту – гэта крымінальна-каральная папярэдняя стадыя іхняга спажывання, якое, як вядома, ў Беларусі цягне крымінальную адказнасць далёка не ўва ўсіх выпадках (гл. арт. 328.2 КК РБ), а ў Расіі – увогуле ніколі. Такім чынам, мы маем юрыдычны нонсэнс, калі асоба, якая не змагла поўнасцю рэалізаваць свой намер, аказваецца ў горшым становішчы, чым той, хто цалкам дасягнуў сваёй сацыяльна непрымальнай мэты (ужыў наркотыкі).

Так ці інакш, трыманне наркотыкаў ува ўсіх яго формах – гэта трывалае злачынства з фармальным складам, таму для прызнання яго скончаным не патрабуецца надыходу якіх бы там ні было вынікаў. Больш за тое, абодва Пленумы (і расійскі, і беларускі) адмыслова падкрэсліваюць, што адказнасць за захоўванне наркотыкаў наступае незалежна ад яго працягласці, то-бок захоўванне пачынаецца фактычна адразу ж пасля набыцця, выкрадання або вырабу адпаведнага рэчыва. На жаль, у расійскай судовай практыцы даволі часта сустракаюцца выпадкі, калі суды (у тым ліку абласныя) выключаюць з абвінавачання указанне на захоўванне



Репозиторий ВГУ

наркотыкаў, спасылаючыся на тое, што яно мела вельмі кароткачасовы характар. Здаецца, гэта грубае скажэнне сэнсу крымінальнага закона.

**Заключэнне.** Такім чынам, погляд на некаторыя парушэнні правіл абарачэння наркотыкаў з пазіцыяў вучэння аб трывалых злачынствах прымушае пераацаніць некаторыя заканадаўчыя падыходы да ўстанаўлення адказнасці за гэткія дзеянні, прычым не толькі с пункту гледжання юрыдычнай формы, але і ў змястоўным плане.


1. Козлов, А.П. Единичные преступления: понятие, классификация, квалификация: учеб. пособие / А.П. Козлов; Краснояр. гос. аграр. ун-т. – Красноярск, 2007. – 280 с.
2. Ришелюк, А.Н. Длящиеся и продолжаемые преступления в уголовном праве: автореф. дис. … канд. юрид. наук / А.Н. Ришелюк. – Киев, 1992. – 25 с.
3. Roxin, C. Besitzdelikte / C. Roxin // Stanje kriminaliteta u Srbiji i pravna sredstva reagovanja. Deo II. – Beograd: Pravni fakultet Univerziteta, 2008. – Str. 9–24.


## О СОСТОЯНИИ КРИМИНОЛОГИЧЕСКОГО ЗНАНИЯ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ


*В.Г. Стаценко*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Целый ряд проблем, связанных с качественной стороной развития криминологических исследований, оценкой их эффективности, подготовкой специалистов в области криминологии и преподавания криминологии, имеют сегодня весьма актуальное значение.

Целью данной публикации является рассмотрение проблем состояния криминологического знания в Республике Беларусь.

**Материал и методы.** Работа выполнена на основе компаративистского метода анализа состояния отечественной и зарубежной криминологии.

**Результаты и их обсуждение.** Анализ состояния криминологии как области научного знания в Республике Беларусь, востребованности результатов криминологических исследований при разработке и реализации антикриминальной государственной политики, свидетельствует о существенной недооценке криминологического научного знания в современных условиях.

В статье М.П. Клеймёнова и И.М. Клеймёнова «Престиж криминологии в мире и в России», обращает на себя внимание тезис, касающийся взаимосвязи уровня развития криминологии в стране и характера политического режима государства. Авторы полагают, что, что высокий уровень развития криминологического знания, проявляющийся в реализации криминологических рекомендаций в уголовной политике, наличии развитой и эффективно работающей системы сообществ профессиональных криминологов, реальном участии общественности в криминологических превентивных программах, характерен, главным образом, для развитых демократических стран. В государствах же с авторитарным и тоталитарным режимом, где главное внимание уделяется социальной практике, криминология «смещается на периферию гуманитарных наук» [1]. Результатом такого подхода к криминологическому знанию и его востребованности является, по мнению цитируемых авторов то, что научный потенциал отечественной криминологии практически не используется в правовой и правоприменительной практике.

Авторы полагают, что подтверждением этого вывода можно, наряду с прочим, считать уровень развития криминологии в Республике Беларусь, отмечая, в частности, что «криминологические исследования в Белоруссии имеют ограниченный характер, состав профессиональных криминологов не имеет высшей квалификации…, в последние годы опубликована только одна крупная криминологическая работа (Свило С.М. Преступность женщин в Республике Беларусь. Мн., 2009)… Слабо представлена криминологическая проблематика в работе Центра судебных экспертиз и криминалистики Министерства юстиции Республики Беларусь... Мало внимания разработке криминологических проблем уделяет Национальный центр законодательства и правовых исследований» [1].

Не отрицая наличия многих проблем, снижающих качество криминологических исследований в Республике Беларусь, полагаем все же возможным не согласиться полностью с указанной оценкой уровня развития белорусской криминологии. Криминологические исследования в стране осуществляются в Академии МВД Республики Беларусь, на юридических факультетах университетов; существенную роль играет в этих исследованиях Научно-практический центр проблем укрепления законности и правопорядка Генеральной прокуратуры Республики Беларусь. В ряде специа-

Репозиторий ВГУ